**У.А. Акуліч**, кандыдат эканамічных навук, дацэнт, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута эканомікі НАН Беларусі

# АСВЯТЛЕННЕ СПАДЧЫНЫ САЙМАНА КУЗНЯЦА Ў ГІСТОРЫІ ЭКАНАМІЧНАЙ ДУМКІ БЕЛАРУСІ: МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСПЕКТЫ

У пачатку 1990-х гадоў, калі з распадам Савецкага Саюза шырокая навуковая грамдскасць атрымала доступ да прац заходніх эканамістаў, з'явіліся новыя супярэчлівыя звесткі адносна месца нараджэння вядомага амерыканскага эканаміста, лаўрэата Нобелеўскай прэміі па эканоміцы Саймана Кузняца. Спачатку ў расійскім часопісе «Эканамічная школа» Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта (МДУ) за 1992 г. з'явіліся звесткі аб тым, што С. Кузнец нарадзіўся не ў Харкаве ва Ўкраіне, як дагэтуль было прынята лічыць, а ў Беларусі, у Пінску. Затым гэта інфармацыя з'явілася на сайце эканамічнай школы МДУ «www.economicus.ru», потым у кнізе расійскага эканаміста Андрэя Анікіна, які асабіста сустракаўся ў 1955 годзе з С. Кузняцом [1, с. 17], затым у Расійскай энцыклапедыі, прысвечанай Нобелеўскім лаўрэатам па эканоміцы [2, с. 36], выдадзенай у 2001 г. пад рэдакцыяй Л. Васінай.

Англійскамоўныя публікацыі пра С. Кузняца, як і чакалася, пацвердзілі інфармацыю аб яго нараджэнні ў горадзе Пінску. Дакладна вядомыя тры аўтарытэтныя крыніцы, якія сапраўды дазваляюць лічыць, што С. Кузнец нарадзіўся ў Пінску і з'яўляецца ўраджэнцам Беларусі. Дзве падрабязныя біяграфіі С. Кузняца напісаны двума вядомымі амерыканскімі эканамістамі Маркам Перлманам (які пісаў прадмову да кнігі Язэпа Шумпэтэра «Гісторыя эканамічнага аналізу») і Робертам Фогелем (лаўрэатам Нобелеўскай прэміі па эканоміцы 1993 г.). У прыватнасці, М. Перлман сцвярджае, што С. Кузнец дакладна нарадзіўся не ў Харкаве, а Р. Фогель называе горад, дзе нарадзіўся С. Кузнец, – Пінск.

Чаму можна давяраць гэтым крыніцам? Па-першае, абодва эканамісты спецыялізуюцца на вывучэнні жыццёвага шляху Кузняца, што абумоўлена не ў апошнюю чаргу тым, што і М. Перлман, і Р. Фогель, як і С. Кузнец, належаць да яўрэйскай нацыянальнасці (прозвішча Перлман перакладаецца як «цукровы чалавек»; С. Кузнец, які па маці – Фрыдман, перакладаецца як «свабодны чалавек». – У.А.). Па-другое, ёсць здагадка, што Р. Фогель мог ведаць С. Кузняца яшчэ з дзяцінства. Яго бацькі эміґравалі ў тым жа 1922 г. (толькі з Адэсы), што і С. Кузнец са сваім братам Саламонам, у адзін і той жа горад

Нью-Йорк. Акрамя таго, Р. Фогель мог ведаць падрабязнасці аб месцы нараджэння С. Кузняца, бо ён быў у свой час аспірантам С. Кузняца і яны маглі ўздымаць гэта пытанне з-за сходнасці сваіх лёсаў, у той час як М. Перлман на падставе толькі літаратурных крыніц і чутак мог даведацца, што месцам нараджэння С. Кузняца быў не Харкаў. Яшчэ адзін амерыканскі эканаміст Мозэс Абрамовіц, таксама яўрэй па нацыянальнасці, са слоў жонкі С. Кузняца – Эдзіт Хандлер-Кузнец (яна таксама была эканамісткай і працавала разам з мужам у Нацыянальным бюро эканамічных даследаванняў) сцвярджае, што С. Кузнец нарадзіўся ў Пінску і скончыў у гэтым горадзе рэальнае вучылішча (будынак былога рэальнага вучылішча захаваўся дагэтуль і сёння там месціцца гарадскі аддзел адукацыі. – У.А.) [3, с. 241].

З вышэйпералічаных прац становіцца вядомым, што С. Кузнец нарадзіўся 30 красавіка 1901 г. ў Пінску ў сям'і гандляроў мяхамі Абрама і Паліны. Ён быў сярэднім з траіх дзяцей. У 1907 г. яго бацька з'ехаў у ЗША, збіраючыся выклікаць туды сям'ю, як толькі ўладкуецца сам. Прычынай эміграцыі Абрама Кузняца (які потым змяніў прозвішча на Сміт, што па-англійску і азначае «кузнец»), на думку аўтара, маглі стаць «яўрэйскія пагромы», якія пракаціліся ў 1905–1906 гадах па паўднёвай і паўднёва-заходняй частцы Расійскай імперыі. І хоць на тэрыторыі Беларусі яны былі рэдкімі, але тыя, якія былі, адбыліся як раз побач з Пінскам – у Рэчыцы і Гомелі (пагромы сталі адной з прычын нябачнай дагэтуль яўрэйскай эміграцыі. Так, у перыяд 1904–1906 гг. з Расійскай імперыі эмігравала больш за 217 тысяч яўрэяў, альбо 70% ад агульнай колькасці людзей усіх нацыянальнасцей, пакінуўшых імперыю).

Далей, паводле звестак Роберта Фогеля, С. Кузнец скончыў мясцовую яўрэйскую гімназію і паступіў у Харкаўскі ўніверсітэт. Тут трэба зрабіць невялікае адступленне. Яўрэйская гімназія, таксама як і рэальнае вучылішча, існавала ў той час у Пінску. Таму версія аб навучанні С. Кузняца менавіта ў гэтай гімназіі, а не ў рэальным вучылішчы, таксама патрабуе праверкі. Асабліва ўлічваючы тое, што дакументы аб тым, што С. Кузнец вучыўся ў рэальным вучылішчы, пакуль не знойдзены, хоць спробы зрабіць гэта прадпрымаў ужо не адзін даследчык. Што датычыцца Харкаўскага універсітэта, то трэба асобна адзначыць, што ў той час на беларускіх землях не было ніводнага ўніверсітэта, і ураджэнцы Беларусі, скончыўшы гімназіі, вымушаны былі паступаць ва ўніверсітэты суседніх губерній. Прычым ураджэнцы Палесся часцей за ўсё ехалі вучыцца ў Кіеўскі альбо Харкаўскі універсітэты.

Далей, па звестках амерыканскіх біёграфаў, пасля двух гадоў навучання С. Кузнец пачаў яшчэ і працаваць у статыстычным аддзеле Цэнтральнага савета прафсаюзаў пры Урадзе Савецкай Украіны. Затым ён стаў нават загадчыкам бюро статыстыкі працы. У 1921 г. у даведніку «Матэрыялы па статыстыцы працы ва Украіне» быў надрукаваны яго першы артыкул «Грашовы заробак рабочых і служачых фабрычна-завадской прамысловасці Г. Харкава ў 1920 годзе» (артыкул выйшаў у свет на рускай мове – У.А.). Аднак пасля таго як па ўмовах савецка-польскай дамовы Заходняя Беларусь адыйшла да Польшчы, і тыя, хто нарадзіўся на гэтай тэрыторыі, змаглі атрымаць польскае грамадзянства, сям'я Кузняцоў перабралася ў Польшчу, а адтуль у 1922 г. тады яшчэ Сямён і яго малодшы брат Саламон эмігравалі ў ЗША.

Як жа магло атрымацца, што большасць савецкіх падручнікаў па дысцыпліне «Гісторыя эканамічных вучэнняў», Энцыклапедыя Нобелеўскіх лаўрэатаў, выдадзеная Нобелеўскім камітэтам Швецыі, а таксама Брытанская энцыклапедыя, адна з самых аўтарытэтных у свеце, памыляліся, сцвярджаючы раней, што С. Кузнец нарадзіўся ва ўкраінскім горадзе Харкаве, а не ў беларускім горадзе Пінску?

Некаторую блытаніну, магчыма, унёс сам С. Кузнец, які ў аўтабіяграфіі, напісанай для Нобелеўскага камітэта ў 1971 г., у графе «месца нараджэння» не напісаў горада, дзе ён нарадзіўся, а абмежаваўся толькі ўказаннем дзяржавы і пазначыў «Расія», маючы на ўвазе, відаць па ўсяму, Расійскую імперыю. Можна выказаць здагадку, што непрязныя адносіны да яўрэяў з боку мясцовых улад і праваслаўнага духавенства, сведкам якой стаў С. Кузнец у дзяцінстве, не зрабіла для яго месца нараджэння

Бацькаўшчынай і не заклала любові да родных мясцін, якая, на думку некаторых навукоўцаў, закладваецца ў чалавека якраз на мяжы 13–14-гадовага ўзросту (г.зн. у тым узросце, калі, верагодна, С. Кузнец яшчэ жыў у Пінску).

Тое, што для яго месца нараджэння не стала сапраўднай Бацькаўшчынай, а хутчэй месцам, з якога ён марыў хутчэй уцячы, можа сведчыць яшчэ адзін факт «памылковага» запаўнення анкеты. Ён пазначыў, што эміграваў у 1922 г. з Савецкага Саюза, хоць вядома, што Польшча ніколі не ўваходзіла ў Савецкі Саюз. І Заходняя Беларусь, з якой эміграваў С. Кузнец, таксама была далучана да СССР толькі ў 1939 г. Гэта значыць, што на момант яго эміграцыі ён не разглядаў ні Беларусь, ні яе Заходнюю частку ў складзе Польшчы, а БССР – у складзе Савецкага Саюза як самастойную краіну. Гэта сведчыць пра поўную апалітычнасць С. Кузняца, бо ён не мог не ведаць пра працэсы будаўніцтва беларускай дзяржаўнасці, якія адбываліся ў тыя часы (напрыклад, пра ўтварэнне БНР, а пасля БССР, бо такія ж працэсы, ды з яшчэ большай сілай працякалі і ва Украіне). Хутчэй за ўсё, С. Кузнец тым самым хацеў падкрэсліць, што месца, адкуль ён эміграваў і дзе нарадзіўся, на момант атрымання ім Нобелеўскай прэміі уваходзіла ў склад Савецкага Саюза, пра які ўсе ведалі за мяжой, у тым ліку ў ЗША і Швецыі. Зрэшты даваць адказ на пытанне аб тым, як ён ставіўся да беларусаў і да іх права на самавызначэнне, яшчэ рана, бо яно патрабуе далейшага вывучэння. С. Кузнец, напрыклад, меў поўны сямейны родавы патрыятызм. Так, у адрозненне ад свайго бацькі, ён за мяжой захаваў сваё арыгінальнае прозвішча, нягледзячы на тое, што яно ў некаторай ступені з'яўляецца цяжка вымаўляльным для англійскамоўных людзей.

Хто з савецкіх альбо ўкраінскіх эканамістаў першым зрабіў «навуковую фальсіфікацыю», палічыўшы, што калі С. Кузнец вучыўся ў Харкаўскім універсітэце, то ён там і нарадзіўся, і калі гэта было зроблена, – да моманту вылучэння на Нобелеўскую прэмію ці пасля яе атрымання, – таксама патрабуе высвятлення. Аднак хутчэй за ўсё гэта адбылося пасля ўшанавання Нобелеўскай прэміяй, таму што лёс С. Кузняца дагэтуль мала каго цікавіў у Савецкім Саюзе. Астатнія эканамісты, не маючы аб'ектыўнай інфармацыі, напэўна, прынялі яе за праўду. Акрамя таго, відаць, мела значэнне тое, што ўжо ў 1960-х гадах С. Кузнец быў забароненым буржуазным эканамістам, бо яго тэорыя сучаснага эканамічнага росту абвяргала асобныя высновы марксіцкага вучэння. Таму і біяграфію гэтага вучонага нельга было поўны час даследаваць больш дэталёва, бо гэта не заахвочвалася ўладамі і забаранялася цэнзурай.

Аднак пра тое, што С. Кузнец сапраўды нарадзіўся не ў Харакаве, сведчыць яшчэ і тое, што дагэтуль украінскія эканамісты не могуць апісаць ніводнага эпізода з жыцця славутага эканаміста да 14 гадоў. Першыя ж пошукі ў Пінску, наадварот, далі станоўчыя вынікі. Каб праверыць звесткі, пазначаныя амерыканскімі і расійскімі эканамістамі, аўтар звярнуўся да Пінскай яўрэйскай суполкі. Старшыня яе Язэп Ліберман сказаў, што ў мясцовай газеце было надрукавана ўжо некалькі матэрыялаў на гэту тэму, фактычна пацвердзіўшы, што ім вядома аб тым, што С. Кузнец нарадзіўся ў Пінску. Аўтарам тых публікацый з'яўляўся Вячаслаў Ільянкоў, журналіст мясцовай газеты «Пінскі веснік». Менавіта гэты журналіст і грамадскі дзеяч (вядомы, напрыклад, яго шырокі удзел ва ўладкаванні магілы Рамана Скірмунта) першым у 2003 г. вярнуў пінчукам і беларусам імя іх славутага земляка. Акрамя таго, прозвішча Кузнец было, прынамсі, у тыя часы, калі там яшчэ жыў будучы вучоны, вельмі распаўсюджаным у Пінску. Так, згодна з кнігай «Памяць г. Пінска», – падчас другой сусветнай вайны фашыстамі было расстраляна 35 чалавек з прозвішчам Кузнец. Цікава, што ў мясцовых грамадскіх колах Пінска памятаюць пра Саймана Кузняца, але ўрыўкава. Так, некаторыя называюць яго Сміт-Кузнец, а некаторыя – Каваль-Кузнец (напрыклад, супрацоўніца мясцовага музея Т.А. Хвачына). Архіўныя дакументы рэальнага вучылішча пакуль не знойдзены ні ў Пінску, ні ў Берасці. Яны могуць быць згублены зусім, а могуць знаходзіцца у Польшчы альбо ў Мінску. Для пачатку тым, хто далей будзе распрацоўваць гэта пытанне, неабходна звярнуцца ў Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ёсць сэнс таксама звярнуцца

з адпаведнымі запытамі да амерыканскіх эканамістаў-бібліёграфаў С. Кузняца – М. Перлмана, Р. Фогеля, М. Абрамовіца, а таксама да Смілавіцкага Леаніда Львовіча, прафесара Інстытута дыяспары пры Тэль-Авіўскім універсітэце, які спецыялізуецца на вывучэнні гісторыі яўрэяў Беларусі.

Такім чынам, сёння не выклікае сумненняў той факт, што С. Кузнец нарадзіўся ў Пінску, але дагэтуль яму не знойдзены дакументальныя пацверджанні. Такія сведчанні маглі б даць і дзеці С. Кузняца, – дачка і сын, якія жывуць цяпер у ЗША і якія абодва, як і іх бацькі, звязалі свой лёс з навукай. Так, сын С. Кузняца, хоць ужо і сталы на гады, яшчэ зусім нядаўна з'яўляўся дзеючым прафесарам Індыянскага ўніверсітэта. У С. Кузняца ёсць таксама чатыры ўнукі. Калі б у каго-небудзь з іх было ўзята інтэрв'ю, у якім блізкі родзіч канчаткова пацвердзіў бы, што С. Кузнец нарадзіўся менавіта ў Пінску, то і гэта сведчанне можна было б залічыць у якасці дакументальнага пацверджання. З пэўных крыніц вядома, што нехта з Пінска, магчыма той жа В. Ільянкоў, ужо ўступіў нядаўна ў перапіску с дзецьмі С. Кузняца [4, с. 2]. А пакуль у Пінску імя Саймана Кузняца прысвоена пінскай агульнаадукацыйнай школе «Бейс-Агарон», на будынку якой вісіць мемарыяльная дошка з надпісам аб гэтым звяршыўшымся факце.

Чаму трэба ўключаць С. Кузняца ў падручнікі па гісторыі эканамічнай думкі Беларусі? Таму, што сам факт нараджэння на беларускай зямлі Нобелеўскага лаўрэата па эканоміцы з'яўляецца для таго падставай. Пры гэтым гаворка не ідзе пра тое, што С. Кузнец з'яўляецца беларускім эканамістам. Сайман Кузнец – гэта амерыканскі эканаміст, яўрэй па нацыянальнасці, які распачынаў сваю эканамічную адукацыю і дзейнасць ва Украіне, але *ж нарадзіўся ён у Беларусі*. Гэта значыць, што С. Кузнец, Нобелеўскі лаўрэат па эканоміцы, – *ураджэнец Беларусі*. Вось гэта і дае падставу ўключаць С. Кузняца ў Гісторыю эканамічнай думкі Беларусі, бо наша краіна дала свету выдатнага эканаміста. Гэты факт з'яўляецца своеасаблівым мастом паміж беларускай і сусветнай эканамічнымі навукамі.

Якія пытанні ў кузнецазнаўстве могуць стаць бацькаўшчынай беларускіх гісторыкаў эканамічнай думкі? Без сумненняў, гэта даследаванне самага цьмянага і нявывучанага перыяду жыцця С. Кузняца – ад моманту нараджэння да эміграцыі ў ЗША. Патрабуе дакументальнага доказу факт нараджэння С. Кузняца ў Беларусі: пошук метрыкі і фотаздымкаў у архівах Беларусі і суседніх краін, пошук месцазнаходжання будынка, дзе ён жыў, дакументаў з рэальнага вучылішча ці яўрэйскай гімназіі, дзе ён атрымліваў пачатковую адукацыю. Беларускія эканамісты могуць мець істотныя перавагі ў гэтым накірунку даследванняў у параўнанні з амерыканскімі біёграфамі С. Кузняца (сярод якіх Р. Фогель, М. Перлман, М. Абрамовіц і іншыя). Рэалізацыя такой даследчай праграмы можа стаць адным са шляхоў да інтэграцыі сучаснай беларускай эканамічнай навукі ў сусветную эканамічную. Выкананне гэтай праграмы можа быць яшчэ больш паспяховым, калі ўдасца аб'яднаць даследчыя намаганні ў гэтых пытаннях беларускіх і ўкраінскіх гісторыкаў эканамічнай думкі, а таксама атрымаць дапамогу ад гісторыкаў і архівістаў абедзвюх краін. Для пачатку ў 2011 г. на базе Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта і Інстытута эканомікі НАН Беларусі можна было б правесці міжнародную навуковую канферэнцыю, прымеркаваную да 110-годдзя з дня нараджэння Саймана Кузняца і прысвечаную вывучэнню даэміграцыйнага перыяду яго жыцця. На гэту канферэнцыю можна было б запрасіць вучоных з Беларусі, Украіны, ЗША, Ізраіля, Расіі, якія даследуюць жыццёвы шлях, дзейнасць і навуковую спадчыну гэтага вядомага ва ўсім свеце вучонага-эканаміста, а таксама яго сваякоў, якія маглі б дапамагчы адшукаць адказы на пастаўленыя пытанні.

У савецкія часы Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт (БДЭУ) насіў імя В.У. Куйбышава. У бягучым 2008 г. асобныя выпускнікі Інстытута народнай гаспадаркі імя В.У. Куйбышава, якія зараз з'яўляюцца высокапастаўленымі чыноўнікамі, выступілі ініцыятарамі правядзення на базе Інстытута НАН Беларусі міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прымеркаванай да 120-годдзя з дня нараджэння В.У. Куйбышава. Адным з заснавальнікаў гэтай канферэнцыі з'яўляецца і БДЭУ. Пры гэтым важна адзначыць, што

В.У. Куйбышаў не мае практычна ніякага дачынення ні да эканамічнай навукі, ні да Беларусі. І калі б сёння стаяла задача прысвоіць сучаснаму БДЭУ імя якога-небудзь вучонага-эканаміста з сусветна вядомым іменем, то кандыдатам №1 у спісе прэтэндэнтаў заслугоўваў бы стаць менавіта Сайман Кузнец. Па-першае, ён мае дачыненне да Беларусі, па-другое – да Пінску, дзе БДЭУ мае свой вядучы філіял. Надаўшы БДЭУ імя Саймана Кузняца, кіраўніцтва эканамічнага ўніверсітэта замацавала б свае прагрэсіўныя памкненні на інтэграцыю беларускай эканамічнай навукі ў сусветную эканамічную навуку і на засваенне сістэмай беларускай вышэйшай эканамічнай адукацыі усіх лепшых дасягненняў сусветнай эканамічнай навукі.

Якія працы С. Кузняца ўключаць да разгляду ў падручнікі па гісторыі эканамічнай думкі Беларусі? Па-першае, тыя, якія лічацца галоўным ягоным укладам у сусветную эканамічную навуку, па-другое, асобныя распрацоўкі, што маюць дачыненне да развіццёвых краін і могуць быць выкарыстаны ў справе наладжвання ў Беларусі развітай рынкавай гаспадаркі. Напрыклад, яго *тэорыя сучаснага эканамічнага роста*, якая сведчыць пра тое, як развіццёвым краінам перайсці на стадыю сучаснага эканамічнага росту і дасягнуць узроўня і стандартаў жыцця развітых краін (адзін з прыкладаў магчымага выкарыстання гэтай тэорыі ў дачыненні да экономікі Беларусі быў паказаны аўтарам у адной з папярэдніх публікацый [5]); яго *сістэма нацыянальных рахункаў*, якая дазваляе павысіць метадалагічны ўзровень беларускай статыстыкі і зрабіць яе адпаведнай міжнародным стандартам; *«закон Кузняца»*, які дазваляе высветліць механізм станаўлення ў краіне сярэдняга класу; *«крывая Кузняца»*, *«цыклы Кузняца»*, якія могуць узбагаціць беларускія падручнікі па макраэкономіцы і гісторыі эканамічных вучэнняў. Па сведчаннях Андрэя Анікіна, Сайман Кузнец праяўляў непрыхаваную сапраўдную цікавасць да праблем эканамічнага росту ў развіццёвых краінах, у тым ліку Савецкім Саюзе. З іншых крыніц вядома таксама аб яго цікавасці да такой дысцыпліны, як «эканамічная гісторыя», у тым ліку да эканамічнай гісторыі Расійскай імперыі. Так што пры дэталёвым вывучэнні шматлікіх прац С. Кузняца сучасным беларускім эканамістам, магчыма, удасца знайсці яшчэ шмат чаго цікавага і ў адносінах да вырашэння тэарэтычных і практычных праблем фарміравання эфектыўнай і канкурэнтаздольнай беларускай экнамічнай мадэлі.

## ЛИТЕРАТУРА

1. Аникин, А.В. Люди науки. Встречи с выдающимися экономистами / А.В. Аникин. – М.: Дело Лтд; Академия народного хозяйства при Правительстве РФ, 1995. – 96 с.
2. Нобелевские лауреаты XX века. Экономика: энциклопед. сл. / под ред. Л.Л. Васиной. – М.: Российская политическая энциклопедия (РОССПЭН), 2001.
3. Abromovitz, M. Simon Kuznets (1901-1985) / M. Abromovitz // The Journal of Economic History. – 1986. – March. – V. 46. – №1. – P. 241–246.
4. Гринкевич, Т. Знаменитый экономист Саймон Смит (Кузнец) родился в Пинске / Т. Гринкевич // Советская Белоруссия. – 2007. – 13 октября.
5. Калупаеў, У.А. Праблема пераходу Беларусі на стадыю сучаснага эканамічнага росту (паводле тэорыі С. Кузняца) / У.А. Калупаеў // XIII межд. науч.-практ. конф. «Управление в социальных и экономических системах». – Минск: Изд-во МИУ, 2005. – С. 132–136.

## РЕЗЮМЕ

Нобелевский лауреат по экономике Саймон Кузнец только учился в Харьковском университете, но родился в Пинске. Исследование доэмиграционного периода его жизни может стать очень важным делом для белорусских и украинских современных историков экономической мысли.